У СВЕЦЕ ПЕРАБОЛЬШАННЯЎ

22 кастрычніка 2026 года створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Грамадская літаратурная школа займалася вывучэннем такога сродку мастацкай выразнасці, як гіпербала.

У традыцыйным тэарэтычным блоку ўдзельнікі немаючага аналагаў у Беларусі грамадска-адукацыйнага праекта пастараліся разабрацца ў тым, што такое гіпербала (з грэцкага *hyperbole* – перабольшанне), для чаго яна неабходная, як дадзены літаратурны троп адрозніваць ад іншых мастацкіх сродкаў, напрыклад, ад метафары, эпітэту, параўнання. Потым атрыманую каштоўную інфармацыю замацавалі на практыцы. Некаторыя моманты ў практычным і аналітычным блоках занятку адсылалі да сфер псіхалагізму і філасофіі мовы (паэтка, філолаг Алена Шаламіцкая). Было шмат цікавых культуралагічных дыскусій не толькі непасрэдна па тэме занятку.



У цэлым, нягледзячы на нешматлікі склад удзельнікаў сустрэчы ў нашым пісьменніцкім офісе, працу літшколы можна ахарактарызаваць, як канструктыўную і вельмі карысную. Яе вынікі адназначна станоўча адаб'юцца на далейшым творчым шляху нашых сяброў (а сярод слухачоў літшколы ўжо ёсць аўтары, прынятыя ў Саюз пісьменнікаў Беларусі). Наперадзе ў нас шмат важнага і не менш цікавага, як, напрыклад, запланаваныя на гэты і 2027 гады публічныя прэзентацыі нашай дзейнасці. Пра іх таксама ішла размова падчас кастрычніцкага занятку. Атмасфера ў калектыве застаецца сяброўскай, добразычлівай, грунтуецца на ўсеагульнай ўзаемнай сімпатыі. А гэта значыць, што будучыня ў нас ёсць, яна светлая і шматабяцальная. І гэта ўжо – ніякае не перабольшанне…



САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

На фота: у створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе адбыўся чарговы занятак. Яго тэма: «Сродкі мастацкай выразнасці. Гіпербала». Офіс ГрАА СПБ, 22 кастрычніка 2026 года.


ГРАМАТА
ДЫПЛОМ
ПАДЗЯКА


ДИПЛОМ
ПАДЗЯКА








ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ
ГА "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"
Дыплом
узнагароджваецца


литература
стран СНГ
Поэзия
Blessed


БЕЛАРУСЬ СЕГОДНЯ
Blessed





Усе разам

Фота Анатоля Апанасевіча